**Шэдзько, А.** Белае сонца Афганістана / А. Шэдзько // Герой працы (Шуміліна). — 2020. — 14 лют. — С. 3.

# БЕЛАЕ СОНЦА АФГАНІСТАНА




Амаль 35 гадоў мінула з таго часу, калі **Васілю Мікалаевічу КАРПУШЭНКУ** давялося выконваць інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане: з дзевяці гадоў вайны ў далёкай ад Беларусі азіяцкай краіне два – на яго «рахунку». Васіль Мікалаевіч не любіць успамінаць тыя гады, і памяць слухае свайго гаспадара, год за годам сціраючы самыя балючыя ўспаміны.

Адслужыўшы ў Запаляр'і тэрміновую вайсковую службу, Васіль Карпушэнка паступіў ў школу прапаршчыкаў, пасля заканчэння якой быў накіраваны служыць у 103-ю Віцебскую гвардзейскую паветрана-дэсантную дывізію на пасаду інструктара па цяжкай паветрана-дэсантнай тэхніцы.

– Пачаў служыць у 1981 годзе, – успамінае Васіль Карпушэнка. – Ужо два гады, як у Афганістан быў уведзены абмежаваны кантынгент савецкіх войск. Менавіта Віцебская 103-я дывізія першай дэсантавалася на афганскую зямлю. Так што ў Віцебску добра ведалі пра тую далёкую вайну, асабліва цяжка было, калі з Афганістана прыляталі цынкавыя труны. Кожны з прапаршчыкаў і афіцэраў добра разумелі, што прыйдзе і яго час выконваць інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане.

Красавік 1984 года Васіль Карпушэнка, які на той момант служыў у асобным батальёне дэсантнага забеспячэння, запомніў на ўсё жыццё. Зранку яго выклікаў камандзір батальёна і паведаміў, што ён і яшчэ адзін прапаршчык і старшы лейтэнант накіроўваюцца ў Афганістан. Васіль Карпушэнка ўжо быў жанатым чалавекам. У памяці засталіся словы жонкі: «Беражы сябе. Ты павінен вярнуцца жывым дзеля сваёй дачкі». Чорна-белы фотаздымак двухгадовай Светы, які ён ўзяў з сабой, стаў сапраўдным талісманам-абярэгам.

Пералёт у Афганістан заняў двое сутак. Родны Віцебск, велічная Масква, горад кветак і фантанаў Ташкент і, нарэшце, Кабул з яго камянямі, пяском і белым асляпляльным сонцам. Разуменне таго, што прыляцелі на вайну, прыйшло адразу: з ваеннага самалёта выходзіла маладое папаўненне, а побач грузілі на борт «Чорнага цюльпана» цынкавыя труны...

Гвардыі прапаршчык Карпушэнка прызначаецца тэхнікам батальёна ў асобным батальёне сувязі 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі. Васіль Мікалаевіч адказваў як за спраўнасць ваеннай тэхнікі, так і за падрыхтоўку вадзіцеляў да дзеянняў у баявых аперацыях. Літаральна на другі дзень Васіль Карпушэнка ў складзе калоны адпраўляецца на баявое заданне ў правінцыю Парван.

«Калона – гэта ад 10 да 40 адзінак тэхнікі, – расказвае ён. – Пераадольваюцца дзясяткі, а то і сотні кіламетраў. А калі ўявіць горныя пераходы, замініраваныя ўчасткі і засады, то шлях да месца прызначэння атрымліваецца вельмі небяспечным і складаным». Падчас першага паходу мужчына пабачыў і першую смерць: салдата, які ехаў на БТР, застрэліў снайпер.

Галоўная задача гвардыі прапаршчыка Васіля Карпушэнкі была ў тым, каб кожная баявая машына дабралася да месца аперацыі. На шляху прыходзілася аператыўна рамантаваць пашкоджаную тэхніку, праяўляючы ўсе ўменні і навыкі.

За два гады ў Афганістане ў Васіля Карпушэнкі было каля 50 баявых аперацый. Баглан і Пулі-Хумры, Парван і Баграм, Нангархар і Джэлалабад, Кандагар і Гардэз для Васіля Мікалаевіча не толькі афганскія правінцыі і гарады, а месцы баявых аперацый, месцы, на якіх правяралася сапраўднае вайсковае братэрства, месцы, дзе кожны з воінаў-інтэрнацыяналістаў годна выканаў загад Радзімы.

Пасля Афганістана Васіль Карпушэнка вяртаецца на службу ў родную 103-ю Віцебскую гвардзейскую паветрана-дэсантную дывізію на пасаду старшыны роты. У той час ён быў самым маладым старшым прапаршчыкам, дарэчы, гэта званне ён атрымаў у далёкай паўднёвай краіне.

За час выканання інтэрнацыянальнага доўгу Васіль Карпушэнка ўзнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі» і «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа», ганаровым знакам ЦК ВЛКСМ «Вайсковая доблесць». Кожны медаль – за выкананне баявых аперацый. Яны – яркае пацвярджэнне таго, што гвардыі старшы прапаршчык Васіль Карпушэнка з гонарам выканаў загад Радзімы і вайсковы абавязак.

**Аляксандр ШЭДЗЬКО**